ЦАНА НУМАРУ 2 КАП.

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ. ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КАМІТЭТАЎ ЛКСМБ

№ 100 (769) Серада, 8-га мая 1929 году. | АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, Вул. Карла Маркса. Тэл. рэдакцыі 12-19, канторы 9-03. | ГОД ВЫДАНЬНЯ VIII.

# ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ IX-му ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ

## Задачы Ўсебеларускага Зьезду Саветаў

**(Вытрымкі з артыкулу А. Г. Чарвякова)**

9-ты Ўсебеларускі Зьезд Саветаў зьбіраецца непасрэдна пасьля XVI-й конфэрэнцыі Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі, якая ў адозьве да ўсіх рабочых і працоўнага сялянства Савецкага Саюзу вызначыла тыя задачы, што пастаўлены гісторыяй перад працоўнымі Савецкага Саюзу . 9-ты Ўсебеларускі Зьезд Саветаў павінен паставіць наступныя вызначаныя ў адозьве XVI-й партконфэрэнцыі, задачы ў цэнтры сваёй увагі і працы, як важнейшыя задачы для працоўных Беларусі.

— Што трэба зрабіць Савецкай Беларусі, як частцы Савецкага Саюзу, каб за магчыма кароткі гістарычны час Савецкі Саюз дагнаў і перагнаў у тэхнічна-эканомічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны;

— што трэба зрабіць, каб забясьпечыць хуткі рост індустрыі і разам з гэтым уздым сельскай гаспадаркі, забясьпечыўшы разгортваньне буйных абагуленых гаспадарак у вёсцы (савгасы, колгасы) на падставе высокай машыннай тэхнікі;

— што трэба зрабіць, каб разгарнуць шырокі рух мас за культуру, зьнішчыць розную збыткоўнасьць, марнатрацтва, безгаспадарчасьць, валакітубюракратызм;

— што трэба зрабіць, каб павесьці далейшы наступ на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, ках іх перамагчы;

— што трэба зрабіць для далейшага ўзмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

9-ты Ўсебеларускі зьезд Саветаў павінен яшчэ больш замацаваць саюз рабочае клясы з сялянствам, як неабходнай падставы для вырашэньня чарговых і агульных задач барацьбы за утварэньні соцыялістычнай грамадзкасьці.

А. ЧАРВЯКОЎ.